**УДК 398**

**С. І. Жураўлёва, Н. І. Новік-Шчарбенка (Мазыр, Беларусь)**

# ПРЫМЕТНІКІ З СУФІКСАМ -*Н*- У МОВЕ ЗАМОЎ ГОМЕЛЬШЧЫНЫ

*Артыкул прысвечаны аналізу прыметнікаў з суфіксам -н- у мове замоў Гомельшчыны. Паказана, што большасць дэрыватаў ужываецца у пераносным значэнні, што павялічвае багацце сэнсавых адценняў як асобных слоў-вобразаў, так і твораў у цэлым і сведчыць аб веры чалавека ў цудадзейную, магічную сілу замоў.*

Замовы – рытмічна арганізаваныя творы формульнага характару, якім надавалася сіла магічнага ўздзеяння для дасягнення розных практычных мэтаў [1, 180]. Яны з'яўляюцца адным з самых старажытных жанраў вуснай народнай творчасці і адлюстроўваюць міфалагічныя ўяўленні нашых продкаў. Замовы лічыліся найбольш дзейсным сродкам уздзеяння на чалавека і розныя рэаліі навакольнага асяроддзя. Вера ў магічную сілу замоў захавалася да нашага часу.

Аналіз лексікі лекавых замоў, сабраных на Гомельшчыне [2], паказвае, што гэты пласт народнай культуры вылучаецца яркай вобразнасцю. Эмацыянальнасць, экспрэсіўнасць слоў і вобразаў, накіраваных на выгнанне хваробы, дасягаецца ў значнай ступені дзякуючы выкарыстанню разнастайных прыметнікаў, шматлікая група якіх (больш за 70 адзінак) утворана ад асноў назоўнікаў пры дапамозе суфікса -*н*-.

Значная колькасць выяўленых прыметнікаў утворана ад асноў абстактных назоўнікаў: *брачны, галодны, грэшны, жаласны (жалосны), карысны, моцны, радасны, сільны, скорбны, смачны, смешны, страшны, ужасны, хлопатны*: *Сілы нябесныя, чаша* ***брачная****, ісцелі Панцелеймон, сваім дарам раба божага (імя)…* [2, 169]; *Як слюна* ***галодная*** *ў роце сохне, так у раба божага (імя) скула засохне…* [2, 89]; *З-пад чорнага камення вызываю сілу цёмную, сілу цёмную, справу грэшную…* [2, 169]; *Первым разам, божым часам заговарываю вас, 12 валаснёў проціперсціца, занагдзіца, ветраная, водзяная, урошчная, пабошчная, падзіўная, пасмешная,* ***жаласная****,* ***радасная****…* [2, 20]; *Зоры-зарыцы, красныя дзявіцы, вазьміце вы ад етага раба божага (імя) крыксы-плаксы, нашніцы ...* ***жалосныя*** *і* ***карысныя****, уцешныя і прысмешныя, светавыя і заравыя…* [2, 94]; *А будзь, маё слова,* ***моцнае*** *на сціханне крыві ў раба (імя) па сей час і сію мінуту…* [2, 68]; *... вороному коню шэлковой травы не с'едаць,* ***сільной*** *росы не співаць…* [2, 199]; *Покрой ты, зарница, мои зубы* ***скорбные*** *своею фатою от проклятого лимаря…* [2, 76]; *Там сталы засціланыя і кубкі наліваныя, там табе піценне, ядзенне,* ***смачнае*** *ўжыванне, лёгкае дыханне…* [2, 24]; *Прымі ету рожу, ад етага чалавека калючую, гаручую, ламучую,* ***смешную****…* [2, 92]; *... усе жывыя і мёртвыя пойдут на* ***страшны*** *суд...* [2, 196]; *Забарані нас і рабу божую (імя) ад* ***ужаснай*** *язвы…* [2, 88].

Шэраг прыметнікаў утвораны ад назоўнікаў з часавым значэннем: *абедні, вечны, вячэрні (вечерні), гадзінны, дзённы, мінутны, начной, палудзённы, палуначны, паўночны, ранні, часінны*: *Шла Маць Прачыстая проці ўтранней,* ***абедней****,* ***вячэрняй*** *зары...* [2, 34]; *... так і здароў буйной галаве раба (імя) будзе ва векі* ***вечныя****…* [2, 170]; *Сінюшка, жаўтушка, сінявачка, паляначка, урочная, прыдзевочная,* ***часінная****,* ***гадзінная****...* [2, 95]; *… так рабе божай (імя) мучыцца не доўга, часок* ***мінутны****...* [2, 27]; *толькі ўмалю прыстрэк мужыцкі, парабоцкі,* ***дзённы****,* ***начны****,* ***паўночны****…* [2, 59]; *Зорачкі-мамачкі* ***ранніе*** *і* ***вечерніе****,* ***дзённые*** *і* ***палудзённые****,* ***начныя*** *і* ***палуначныя****…* [2, 41].

Ад асноў матэрыяльна-рэчыўных назоўнікаў утвораны прыметнікі са значэннем саставу, прызначэння, якасці: *булатны, бумажны, вінны, водны, гразны, жалезны, жамчужны, каменны, малочны, медны, пенны, сахарны, срэбны, стальны*: *На том камне сядзела дзявіца-масцярыца, дзяржала іглу* ***булатную****, зашывала рану крывавую…* [2, 40]; *Еду за мора, за красныя дзевіцы, на* ***бумажныя*** *пярыны…* [2, 27]; *Як гэтым царыкам у кучу не сходзіцца, за цясовыя сталы не садзіцца,* ***вінных*** *чар не наліваці...* [2, 205]; *Памагіце мне вышаптаць, выгаварыць усякі прычыны ўраджённыя, злённыя, прыдуманыя, прыстроеныя, сухотныя,* ***водныя****,* ***каменныя****…* [2, 32]; *Штоб вочы сматрэлі, вушы ні балелі ў рабы (імя), адкаціліся, атваліліся к чужым берагам, на* ***гразную*** *воду, на сырую непагоду…* [2, 146]; *Як у моры сінім да на крутым беразе ёсць Алатыр-камень, на камне том расце кукіш-трава, калі згрызаеш і зкусаеш усе валасы* ***медныя****, усе зубы* ***жалезныя****...* [2, 87]; *... на той траве –* ***жамчужная*** *раса…* [2, 137]; *Рака* ***малочная****, вадзяная і крывяная…* [2, 28]; *... хай раб (імя) не п'е віна зелена, брагу хмельну, піва* ***пенна*** [2, 168]; *Твая хатка ў лазе, на курынай назе, там сталы засціланы, кубкі наліваны,* ***сахарныя*** *напіткі...* [2, 82]; *Месяц ты, месячык,* ***срэбныя*** *рожкі, златыя ножкі…* [2, 68]; *Бег ваўчок,* ***стальныя*** *хвасток, ільняныя ножкі…* [2, 44].

У мове замоў Гомельшчыны сустракаюцца прыметнікі, утвораныя ад назоўнікаў са значэннем месца, напрамкаў свету: *балотны, банны, восточны, горны, лясны, рачны, усходні*: *Гэй вы, змяі* ***лясныя****,* ***балотныя*** *і падкалодныя, спаўзайцеся, збірайцеся…* [2, 46]; *Ты, зоря-зорніца, зоря – красна дзевіца, зоря Марімьяна, ... от віхря сільного, от* ***банного****, от водзяного, от* ***лесного****…* [2, 52]; *Встану, благословясь, пойду, перехресясь із дверей в дверi, із ворот в ворота, под восток, под* ***восточну*** *сторану...* [2, 58]; *У тебя, распроклятое, отсекаю лапу я и бросаю в леса дремучие,... четвертую скидываю с* ***горной*** *кручи…* [2, 150]; *Цар* ***рачны****, дай вады наболтанай...* [2, 165]; *Устану я, раб божы (імя), благаслаўлюся, пайду, перахрышчуся, з дзвярэй у дзверы, з варот у вароты, пад* ***усходнюю*** *старану...* [2, 193].

Асобныя прыметнікі ўтвораны ад назваў органаў і частак цела чалавека (*глазны, галаўны, жыльны, зубны, костны, пупавінны*), ад назваў хвароб чалавека, іх прычыны (*каўтунны, прастудны, прыгаворны, сухотны, урочны*): *Выгаварваю скулу-скуліцу, красную дзявіцу,... рабіцу касцяную, грудавную,* ***галаўную****,* ***глазную****...* [2, 212]; *Зуб, зуб, не балі,* ***зубную*** *боль удалі…* [2, 26]; *Ламоціца, шчіпоціца,* ***костны*** *радзімец, усе суставы і полусуставы,... не скрыпіце...* [2;57]; *Ты, шчука, вынь з раба божага (імя) грыжу-кілу красну, белу, нутрану, касцяну,* ***жыльну****,* ***пупавінну****, мядову…* [2, 89]; *... Бога урашываю скулу* ***ўрочную****,* ***прыгаворную****, прышчыкаватую, бураватую,* ***каўтунную****...* [2, 32]; *Там яны гуляюць і сталы засцілаюць, і ўсіх лішаёў дажыдаюць: і красных, і белых, і луплёных, і калёных, і падзіўных, і* ***прастудных****...* [2, 33]; *Памагіце мне вышаптаць, выгаварыць усякі прычыны ураджённыя, злённыя, прыдуманыя, прыстроеныя,* ***сухотныя****...* [2, 32].

МГПУ им. И.П.Шамякина

Нязначная колькасць прыметнікаў утворана ад адушаўлёных назоўнікаў, якія абазначаюць назвы асоб, чыноў нябеснай іерархіі (*вражны*, *апостальны*, *господні*), назвы жывёл (*конны*): ... *избави нас от всех навет* ***вражних****...* [2, 179]; *На моры, на акіяне, на востраве Буяне стаіць саборная* ***апостальная*** *царква…*[2, 154]; *Рання зараніца,* ***господня*** *памашніца…* [2, 20]; *Первым разам, добрым часам выгаварваю зляк ляконны, пуганны, начны, палуночны, дзённы, палудзённы, ... парасячы,* ***конны****...* [2, 156].

Такім чынам, аналіз прыметнікаў з суфіксам -*н*- у мове замоў Гомельшчыны паказвае, што названыя ўтварэнні – распаўсюджаная з'ява. Большасць дэрыватаў ужываецца, як правіла, у пераносным значэнні, што павялічвае багацце сэнсавых адценняў як асобных слоў-вобразаў, так і твораў у цэлым і сведчыць аб веры чалавека ў цудадзейную, магічную сілу замоў.

**Літаратура**

1. Беларуская міфалогія: энцыклапедычны слоўнік / С. Санько [і інш. ], склад. І. Клімковіч. – Мінск: Беларусь, 2006. – 599 с.

2. Вяргеенка, С. А. «На моры-акіяне, на востраве Буяне...» (лекавыя замовы Гомельшчыны): фальклорна-этнаграфічны зборнік / С. А. Вяргеенка; пад рэд. В. С. Новак. – Гомель: ГДУ імя Ф. Скарыны, 2009. – 220 с.

МГПУ им. И.П.Шамякина